26 Калужинский Г. Святогорская Успенская общежительная пустынь в Харьковской епархии / Г. Калужинский. – Х.: Типография окружного Штаба, Немецкая, № 26, 1884. – С. 78.
27 Там само.
28 Филарет (Гумилевский). Историко-статистическое описание Харьковской епархии: в 3 т. / Филарет (Гумилевский). – Х.: Райдер, 2004. – Т. 2: Краткий обзор епархии и монастыри. – 2004. – Т. 1. – С. 52.
29 Там само.
30 ДАХО. – Ф. 40. – Оп. 108. – Спр. 101. – Арк. 13.
31 Там само. – Арк. 54.
32 Там само. – Спр. 101. – Арк. 17.
33 Там само. – Спр. 184-а. – Арк. 142; Ф. 40. – Оп. 108. – Спр. 101. – Арк. 6, 17, 19; Ф. 40. – Оп. 108. – Спр. 139. – Арк. 51.
34 Там само. – Спр. 139. – Арк. 52.
35 Там само. – Спр. 184-а. – Арк. 142; Ф. 40. – Оп. 108. – Спр. 108. – Арк. 18.

**SUMMARY**
**Mykola Yatsyuk**
MUNICIPAL AND PROPERTY COMPLEX GROWTH OF SETTLEMENT MONASTERIES OF THE XVIII–XIX CENTURIES
Examined problem of municipal and property complex growth of settlement monasteries of Slobozhantshina of the XVIII–XIX centuries. The researcher has highlighted the main stages of the economic basis of cloisters and analysed the specific features of the structural elements of monastic economy for the given period of time.
Key words: monasteries, church, economy, landownership, works, crafts, trade, Slobidska Ukraine.

***Алена Філатава,***

***кандыдат гістарычных навук,***
***старшы навуковы супрацоўнік***
***Інстытута гісторыі НАН Беларусі***

# ПРАВАСЛАЎНЫЯ БРАЦТВЫ УКРАІНЫ, БЕЛАРУСІ І ЛІТВЫ Ў КАНЦЫ XVIII – ПАЧАТКУ XIX СТ.: ГІСТАРЫЯГРАФІЯ

В історіографії XIX–XXI ст. найбільш дослідженою є історія православних братств України, Білорусі, Литви в XVI–XVII ст. та у другій половині XIX – на початку XX ст. Найменше вивченим залишається період кінця XVIII – початку XIX ст., що спричинило появу суперечливих суджень про їхнє існування та діяльність.
***Ключові слова:*** *православні братства, Православна церква, західні губернії Російської імперії.*

Вывучэнне гісторыі стварэнне і дзейнасці праваслаўных брацтваў у Рэчы Паспалітай, а затым у заходніх губернях Расійскай імперіі пачалася ў XIX ст. і

працягваецца ў наш час[1]. Напрыклад, расійская даследчыца І. Гажва, лічыць, як і ў мінулыя часы, што брацтвы, якія з'явіліся ў XV–XVI ст., калі становішча Праваслаўнай царквы ў «западном крае страны, в Белоруссии и на Украине» ускладнілася з-за прапаганды каталіцызму і імкнення звярнуць праваслаўнае насельніцтва да ўніі. Таму Праваслаўная царква прыняла меры па стварэнню грамадстваў для абароны веры і збераджэння правоў заходнерускага праваслаўнага народу, першапачатковай мэтай якіх было місіянерскае служэнне Царкве. На яе думку, ў XVII ст. брацкі рух распаўся[2]. Цікава, ці ведае сучасны расійскі аўтар, што заходні край краіны, гэта не Расія, а ўсходняя частка Рэчы Паспалітай?

Уплыў праваслаўных брацтваў на культурнае жыццё на Украіне і Беларусі ў XVI–XVIII ст. разглядалі А. Савіч[3], Я. Ісаевіч, які пісаў, што гісторыя Львоўскага Успенскага брацтва закончылася ў 80-х гг. XVIII ст. У той жа час іншыя брацтвы Галіцыі, Холмшчыны і Правабярэжнай Украіны зберагліся да XIX ст., аднак страцілі значэнне цэнтраў грамадска-палітычнай дзейнасці, удзельнічаючы толькі ў бытавой і культурнай дзейнасці. А з XIX ст. брацтвы Правабярэжнай Украіны былі падпарадкаваны духавенству і перасталі граць якую-небудзь ролю ў грамадска-палітычным і культурным жыцці[4]. Той жа думкі прытрымліваецца і беларускі даследчык М. Батвіннік, які таксама пісаў, што пасля далучэння Беларусі і Украіны да Расійскай імперыі ў канцы XVIII ст. праваслаўныя брацтвы страцілі сваё грамадска-палітычнае і культурнае значэнне[5].

Д. Сцепуро паказаў, як страчваліся пазіцыі Віленскага Свята-Духаўскага брацтва ў XVII–XVIII ст. Звязана гэта было з тым, што на 1 студзеня 1765 г. у Вільні было ўсяго праваслаўных – 40 мужчын і 27 жанчын.

Акрамя таго, у 1793 г. гэтае брацтва скардзілася Пераяслаўскаму епіскапу Віктару (Садкоўскаму) на цяжкі стан, у якім аказаўся манастыр, што было, на іх думку, звязана з дрэнным кіраваннем Іакінфа Пелкінскага, які ўтрымліваў манастырскія даходы, аддаваў на «вечный чинш» брацкія землі за самую малую плату і інш.[6] Г. Шлевіс лічыў, што гэта было яшчэ звязана і з тым, што ў 1748 і 1749 г. у Вільні былі пажары і храм Св. Духа згарэў, у тым ліку і будынак брацкай школы, дзейнасць якой не аднаўлялася[7].

Польскі даследчык А. Міроновіч пісаў, што напрыклад, Беларускі праваслаўны епіскап Георгій (Каніскі) быў супраць таго, каб брацтвы прысвойвалі сябе царкоўныя функцыі, аб гэтым, напрыклад, сведчыла тое становішча, якое склалася ў царкве Святых Петра і Паўла ў Магілёве, брацтва якой выпякала прасфоры. Епіскап быў супраць такой практыкі і загадаў гэта рабіць царкоўным асобам[8].

Некаторыя аўтары звярнулі ўвагу на дзейнасць Пінскай кангрэгацыі 1791 г., у якой прымалі ўдзел і прадстаўнікі ад праваслаўных брацтваў Рэчы Паспалітай[9]. Так, на думку А. Міроновіча, рэлігійнае і культурнае жыццё Праваслаўнай царквы Рэчы Паспалітай у часы праўлення караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага, галоўным чынам, абапіралася на манастыры і царкоўныя брацтвы. Менавіта на брацтвы, нягледзячы на тое, што яны не былі ў гэты час так арганізаваны, як у мінулым, быў ускладзены абавязак па абароне духоўных і матэрыяльных інтарэсаў і функцыяніравалі пры большасці манастыроў і праваслаўных

прыходаў. З 109 дэлегатаў, якія прыбылі на Пінскую кангрэгацыю, у тым ліку 25 прадстаўнікоў чорнага духавенства, 22 белага і 56 прадстаўнікоў ад прыходаў, сярод якіх было 30 чалавек ад 17 брацтваў з Вільні, Друі, Дзісны, Драгічына, Бельска, Заблудава, Турова, Лебедні (Lebiedna), Шпола (Szpola), Златаполя (Zlotopola), Пінска і Мазыра[10].

Няма поўных звестак аб агульнай колькасці праваслаўных брацтваў у XVIII ст. у Рэчы Паспалітай, напрыклад, такіх як кніга Б. Лоренс[11] па Перамышльскай епархіі, дзе сабрана інфармацыя аб колькасці брацтвах у мястэчках і сельскай мясцовасці гэтай епархіі.

Дзейнасці праваслаўных царкоўных брацтваў прысвечана праца І. Флёрова, на думку якого ў Рэчы Паспалітай царкоўныя брацтвы, як грамадствы, падобныя ў некаторых выпадках з даўно ўжо існаваўшымі свецкімі брацтвамі, былі звычайнай з'явай ў вачах польскіх каралёў[12]. І калі брацтвы былі звычайнай з'явай для Рэчы Паспалітай, то, напрыклад, Р. Жудро пісаў, што пасля далучэння Беларусі да «Великой России и с утверждением в ней склада в духе великорусской жизни, братские порядки должны были постепенно уничтожаться, т. к. идея братств была незнакома русской церкви»[13].

Даследчыкі адзначалі, што да часу далучэння тэрыторыі Украіны, Беларусі і Літвы да Расійскай імперыі з брацтваў, якія мелі важнае значэнне пры абароне правоў Праваслаўнай царквы ў Рэчы Паспалітай, дайшлі толькі бельскае, магілёўскае і віленскае брацтвы, іншыя, пад «латино-польским» уціскам перайшлі да Уніяцкай царквы. Нягледзячы на гэта ў XVIII–XIX ст. працягвалі існаванне і нават зноў адчыняліся брацтвы ў мястэчках і сёлах Маларосіі і Беларусі[14].

Нягледзячы на пануючае становішча Праваслаўнай царквы ў Расійскай імперыі, брацтвы знаходзіліся ў даволі цяжкім стане. Так, С. Рункевіч пісаў, што ў Пінску, пасля далучэння да Расіі, заставаўся толькі адзіны праваслаўны манастыр, які быў і прыходскай царквой. Брацтва, якое было пры манастыры, скардзілася Мінскай духоўнай кансісторыі, што манахам няма за жыць[15]. Р. Жудро адзначаў даволі складаныя адносіны паміж брацтвамі і царкоўнымі ўладамі. Так, у 1797 г., па прадстаўленню Магілёўскага праваслаўнага епіскапа Афанасія (Вальхоўскага), быў зачынены Магілёўскі дзявочы брацкі манастыр, нягледзячы на тое, што грамадскасць хадайнічала перад Свяцейшым Сінодам аб тым, каб манастыр пакінулі. У 1828 г., па прадстаўленню Магілёўскага епіскапа Паўла (Морава), звычайным манастыром стаў і Магілёўскі брацкі мужчынскі манастыр, у дадзеным выпадку грамадскасць нават і не скардзілася[16].

Аб дзейнасці Магілёўскага праваслаўнага епіскапа Афанасія (Вальхоўскага) у адносінах брацтваў пісаў і П. Гаручка[17]. Аўтар лічыў, што гэты епіскап быў праціўнікам брацтваў, лічыў іх «ненужными», акрамя таго у братчыкаў бачыў «незаконных соперников духовенства»[18]. 4 студзеня 1796 г. епіскап Афанасій напісаў обер-пракурору Св. Сінода графу А. Мусін-Пушкіну, што ў Магілёўскім брацкім манастыру ўсімі «доходами и всякими заведывают старосты церковные и братчики, не допуская к тому монастырских настоятелей», ён лічыў, што ў часы праўлення Кацярыны ІІ, калі няма ганенняў на Праваслаўную царкву, то «надлежит действовать по высочайшим указам, в силу коих церкви с имением

их должны быть в ведении при монастырях настоятелей монастырских»[19] . 30 студзеня 1796 г. А. Мусін-Пушкін парэкамендаваў епіскапу, каб ён звярнуўся да генерал-губернатара. Паколькі братчыкі магілёўскай брацкай царквы не павінаваліся царкоўным уладам, то 15 чэрвеня 1797 г. епіскап Афанасій прадпісаў, што «старосты и братчыки, расточив не мало церковных денег не только оных церквей не уплачивают, и подлежащего счета чрез долгое время по многократным требованиям не здают и вновь приходящие за церковные дома и лавки доходы к себе забирают, а ныне и сроки контрактам оканчиваются, то повелеваем учинить чрез кого следует публики с вызовом охотников таковые дома и лавки взять в наймы и по заключению вновь контрактов выручаемые с них деньги принимать при старостах отцу игумену с верными записками в книгу консистории»[20] .

У гістарыяграфіі XIX–XXI ст. найбольш даследаванай з'яўляецца гісторыя праваслаўных брацтваў Украіны, Беларусі і Літвы, тэрыторыя якіх уваходзіла ў склад Рэчы Паспалітай у XVI–XVII ст. і заходніх губерняў Расійскай імперыі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Меньш за ўсё даследаваны перыяд канца XVIII – пачатку XIX в., што прывяло да існавання супярэчлівых думак аб іх існаванні і дзейнасці.

1 Крамаренко М. Западнорусские церковные братства, их происхождение и значение / М. Крамаренко. – Киев: Тип. «Петр Барский», 1913; О деятельности православного церковного братства при Пустынском Успенском монастыре. – СПб.: Тип. МВД, 1872.; Папков А. А. Братства. Очерк истории западнорусских братств. – Свято-Троицкая Сергиева лавра, 1900; Православие в духовной жизни Беларуси. – Брест: БрГУ им. А. С. Пушкина, 2008; Православные монастыри Беларуси. – Минск: Четыре Четверти, 2003 і інш.

2 Гажва И. А. Религиозно-просветительная деятельность православных братств Центральной России во второй половине XIX – начале XX вв. (на материалах Владимирской и Костромской губерний): автореф. дисс. ... канд. ист. наук / И. А. Гажва. – Иваново: Тип. ГОУ ВПО «ИГПУ», 2008. – С. 1.

3 Савич А. Нариси з історії культурих рухів на Вкраїні та Білорусі в XVI–XVIII в. / А. Савич. – К.: Друк. ВАН, 1929.

4 Ісаєвич Я. Д. Братства та їх роль в розвитку української культури XVI–XVIII ст. / Я. Д. Ісаєвич. – К.: Наукова думка, 1966. – С. 46, 207.

5 Батвіннік М. Брацтвы праваслаўныя // Вялікае княства Літоўскае: У 2 т. – Мінск: БелЭнц., 2007. – Т. 1. – С. 348.

6 Сцепуро Д. Виленское Свято-Духовское братство в XVII и XVIII столетиях / Д. Сцепуро. – К.: Тип. И. И. Горбунова, 1899. – С. 164, 168, 169.

7 Шлевис Г. Православные святыни Вильнюса / Г. Шлевис. – Вильнюс: Св.-Духов монастырь, 2003. – С. 14.

8 Mironowicz A. Diecezja Białorusra w XVII i XVIII wieku /A. Mironowicz. – Białystok: Wyd-wo Uniwersytetu w Białystoku, 2008. – S. 237.

9 Беднов В. А. Православная церковь в Польше и Литве (по Volumina Legum) / В. А. Беднов. – Минск: Лучи Софии, 2002; Коялович М. О. История воссоединения западнорусских униатов старых времен (до 1800 г.) / М. О. Коялович. – Минск: Лучи Софии, 1999; Mironowicz A. Bractwa cerkiewne w Rzeczypospolitej / A. Mironowicz. – Bialystok: Druk POP, 2003 і інш.

10 Mironowicz A. Bractwa cerkiewne… – S. 79, 81.
11 Lorens B. Bractwa cerkiewne w eparhii przemyśkiej w XVII i XVIII wieku. / B. Lorens. – Rzeszów: Wyd-wo Uniwersytetu Rzeszowskiego, 2005. – S. 310–316.
12 Флеров И. О православных церковных братствах, противоборствующих унии в юго-западной России в XVI, XVII и XVIII столетиях / И. Флеров. – СПб.: Изд. книгопродавца Н. Г. Овсянникова, 1857. – С. 18.
13 Жудро Р. История Могилевского Богоявленского братства / Р. Жудро. – Могилев на Днепре: Скоропечатня и литография Ш. Фридланда, 1890. – С. 68.
14 Харлампович К. А. [Рец. на:] А. Папков. Братства. Очерк истории западнорусских братств. Св.-Троицкая Сергиева лавра, 1900 // Православный собеседник… октябрь 1900. – Казань, 1900. – С. 464.
15 Рункевич С. История Минской архиепископии (1793–1832 гг.). / С. Рункевич. – СПб.: Тип. А. Катанского и К., 1893. – С. 478.
16 Жудро Р. История Могилевского Богоявленского братства. – С. 84.
17 Горючко П. С. Афанасий Вольховский, епископ Могилевский и Полоцкий (с 5 марта 1795 года по 27 августа 1797 года) / П. С. Горючко. – Могилев: Скоропечатня и литография Ш. Фридланда, 1902; Его же Афанасий Вольховский, четырнадцатый епископ Могилевский (с 5 марта 1795 года по 27 августа 1797 года) // Могилевская епархия. Историко-статическое описание. – Могилев: Скоропечатня и литография Ш. Фридланда, 1908. – Т. 1. – Вып. II. – Ч. 1.– С. 366–394.
18 Горючко П. С. Афанасий Вольховский, епископ Могилевский и Полоцкий… – С. 9.
19 Там же. – С. 10.
20 Там же – С. 11.

**SUMMARY**

**Alena Filatova**

ORTHODOX CHRISTIAN BROTHERHOODS IN UKRAINE, BELARUS AND LITHUANIA IN THE LATE XVIIITH – EARLY XIXTH CENTURIES: HISTORIOGRAPHY

The history of Orthodox Christian brotherhoods of, Ukraine, Belarus and Lithuania in the XVIth – XVIIth centuries and in late XIXth – early XXth centuries has been studied comprehensively by the historians in the XIXth – XXIst. centuries. Meanwhile the period of late XVIIIth – early XIXth centuries is much less studied in historiography. This situation caused existence of contradictory approaches to and opinions about brotherhoods' history and activities.

Key words: Orthodox Christian Brotherhoods, Orthodox Christian Church, Western Provinces of Russian Empire